– С. 167–180, № 11 (часть официальная). – С. 191–205, № 12 (часть официальная). – С. 215–220.
29. Акты депутатов духовенства Минского окружного училищного съезда, бывшего в м. октябре прошлого 1895 года // Минские епархиальные ведомости. – 1896. – № 4–5 (часть официальная). – С. 77–96.
30. Акты депутатов Минского окружного съезда духовенства, бывшего в месяце декабре 1896 года // Минские епархиальные ведомости. – 1897. – № 9 (часть официальная). – С. 173–178, № 10 (часть официальная). – С. 195–204, № 11 (часть официальная). – С. 213–228.
31. Акты депутатов Минского окружного училищного съезда духовенства, бывшего в декабре месяце 1898 года // Минские епархиальные ведомости. – 1899. – № 7 (часть официальная). – С. 127–132, № 8 (часть официальная). – С. 142–157.
32. Отчет о приходе, расходе и остатке сумм, поступивших на содержание Минского духовного училища, как от церквей и духовенства, так и из других источников за 1899 год // Минские епархиальные ведомости. – 1900. – № 15–16 (часть официальная). – С. 313–330.
33. Акты депутатов Минского окружного училищного съезда духовенства, бывшего в сентябре месяце 1899 года // Минские епархиальные ведомости. – 1900. – № 6 (часть официальная). – С. 123–127, № 7 (часть официальная). – С. 144–148.
34. Отчет о приходе, расходе и остатке сумм, поступивших на содержание Минского духовного училища, как от церквей и духовенства, так и из других источников за 1900 год // Минские епархиальные ведомости. – 1901. – № 18 (часть официальная). – С. 384–389, № 19 (часть официальная). – С. 402–414.

*Материал поступил в редакцию 23.10.13*

**VOSOVICH S.M. The history of acquisition and accomplishment of the buildings of Minsk men's religions school**

The author examines the history of acquisition of the buildings of Minsk clerical school for men in the second half of the XIXth century. The conclusion is made that the clergy of Minsk school district, despite numerous difficulties, displayed a worthy care about the accomplishment of the premises of the local lower men's clerical school.

УДК 94,438 (“1926-1931”)

***Гарматны В.П.***

# АГРАРНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМЕ СЯЛЯНСКАЙ ПАРТЫІ (1926–1931)

Рэпазіторый БрГТУ

**Уводзіны.** На працягу ўсяго існавання ІІ Рэчы Паспалітай (1921–1939) асаблівую ролю ў грамадска-палітычным жыцці краіны адыгрывалі сялянскія партыі (ludowcy, “людаўцы”), колькасць якіх даходзіла да пятнаццаці. Большасць насельніцтва дзяржавы (каля 2/3) у гэты час складала сялянства, якое востра пакутавала ад зямельнага голаду і ўскладала на прадстаўнікоў сялянскага руху вялікія спадзяванні [5, с. 187]. Патрэба аграрнай рэформы ў Польшчы на пачатку 1920-х гг. была настолькі відавочнаю і тэрміноваю, што ні адна з існуючых палітычных партый краіны не выступала супраць яе ажыццяўлення.

Сялянскія партыі паважалі сялянства як галоўную вытворчую сілу, фундамент краіны і прыкладалі ўсе намаганні да заняцця сялянамі адпаведнага месца ў сацыяльнай структуры ІІ Рэчы Паспалітай. Разам з тым сялянскі рух не быў адзіным, што стварала вялікія арганізацыйныя цяжкасці і замаруджвала дасягненне пастаўленых задач [8, с. 309]. Нават у асяроддзі асобных сялянскіх партый не былі пераадолены галоўныя супярэчнасці, наконт шляхоў вырашэння якіх ішлі гарачыя дыскусіі [6, с. 52].

**Сярод палітычных арганізацый ІІ Рэчы Паспалітай** неабходна асабліва адзначыць Польскую Народную Партыю-“Вызваленне” (Polskie Stronnictwo Ludowe-“Wyzwolenie”, 1915–1931), якая займала сярод сялянскіх партый другое месца, саступаючы ПНП-“Пяст” (PSL-“Piast”, 1889–1931 гг.) [11, с. 131]. На працягу свайго існавання ПНП-“Вызваленне” перажыла некалькі разломаў, што ў значнай ступені негатыўна адбілася на аўтарытэце і ўплыву партыі. Так, напрыклад, 3 студзеня 1926 г. на надзвычайным пасяджэнні Галоўнай управы (Zarząd Główny) ПНП-“Вызваленне” з шэрагаў партыі быў выключаны Ян Домбскі (Jan Dąbski) разам з групаю сваіх паплечнікаў па абвінавачванні ў правядзенні неадпаведнай праграме палітыкі і расколе арганізацыі з мэтаю задавальнення ўласных амбіцый. Акрамя таго, была прынята пастанова аддаць пад партыйны суд дзевяць сеймавых паслоў (дэпутатаў) за непадпарадкаванне і нелаяльнасць да вышэйшых партыйных улад. Непасрэднаю прычынаю прыняцця такога рашэння стала імкненне Домбскага да аб’яднання ПНП-“Вызваленне” з Сялянскім Саюзам (Związek Chłopski) [2, с. 385; 7, с. 263].

Выдаваемая прыхільнікамі Домбскага “Gazeta Ludowa” (“Народная газета”) у нумары за 10 студзеня 1926 г. падкрэслівала, што іх выключэнне з шэрагаў ПНП-“Вызваленне” адбылося за вядзенне барацьбы па аб’яднанні сялян і класавага сялянскага руху. У хуткім часе Домбскі і яго аднадумцы схіліліся да заснавання ўласнай партыі, аб чым абвесціла “Gazeta Ludowa” ў нумары ад 17 студзеня 1926 г. і аб’явіла сябе друкаваным органам адзначанай арганізацыі. На старонках газеты была размешчана адозва новага сеймавага клуба “Сялянская Партыя” (“Stronnictwo Chłopskie”, СП), дата падпісання якой – 12 студзеня 1926 г. – лічыцца днём нараджэння арганізацыі [4, с. 78]. Разам з тым трэба адзначыць, што ў склад СП увайшлі часткі розных палітычных арганізацый, дзякуючы чаму партыя ахапіла значную колькасць ваяводстваў, але гэта стварыла значныя цяжкасці ў выпрацоўцы адзінай праграмы [3, с. 285].

Аўтары адозвы сцвярджалі, што па аднаўленню ў 1918 г. Польшчаю незалежнасці сяляне з-за таго, што ўлада ў дзяржаве перайшла ў рукі памешчыкаў і капіталістаў, панеслі найвялікшыя цяжкасці на карысць краіны і ў выніку былі даведзены да галечы. Домбскі і яго прыхільнікі востра крытыкавалі ПНП-“Пяст” за супрацоўніцтва з правымі арганізацыямі, а ПНП-“Вызваленне” – за сумесную, але некарысную для сялян дзейнасць з Польскай Партыяй Сацыялістычнай (ППС, Polska Partya Socialistyczna) [7, с. 264].

22 студзеня 1926 г. Клуб СП аб’яднаўся з Клубам Сялянскага Саюза, старшынёю новага клуба стаў Домбскі, а друкаваным органам – газета “Gazeta Ludowa” (14 лютага 1926 г. пераіменавана ў “Gazety Chłopsky”, “Сялянскую газету”) [16, с. 29–31]. У лютым 1926 г. у СП уступіла значная частка членаў Сялянскай Радыкальнай Партыі (Chłopskie Stronnictwo Radykalne), і ўжо ў хуткім часе па сваім уплыве і колькасці членаў СП сярод сялянскіх партый выйшла на трэцяе месца. СП цесна ўзаемадзейнічала з Крэсоваю Сялянскаю Партыяй (Kresowe Stronnictwo Chłopskie), якая потым увайшла ў яе склад, што дазволіла распаўсюдзіць дзейнасць партыі амаль на ўсю ІІ Рэч Паспалітую (за выключэннем заходніх ваяводстваў) [9, с. 159]. Неабходна адзначыць, што з самага пачатку сваёй дзейнасці СП выступала за адзінства сялянскага руху і прыкладала да гэтага ўсе намаганні [4, с. 78]. СП прапагандавала ідэю агульных мэтаў і інтарэсаў усёй вёскі,

***Гарматны Віталь Пятровіч,*** *магістр гістарычных навук, аспірант 3 года навучання кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт”.*

выкарыстоўваючы пры гэтым лозунг “класавай сялянскай палітыкі” (klasowej polityki chłopskiej). Партыя падкрэслівала неабходнасць ліквідацыі шкоднага для вёскі капіталістычнага ладу і правядзенні самастойнай сялянскай палітыкі [2, с. 386].

Прыняты Сеймам ІІ Рэчы Паспалітай закон аб аграрнай рэформе, які ўступіў у сілу 28 снежня 1925 г., СП крытыкавала як недастатковы і няздольны вырашыць супярэчнасці ў сельскай гаспадарцы [10, с. 167–168]. Разам з тым, як адзначалі лідары СП, нават самая радыкальная аграрная рэформа не вырашыць усіх грамадска-палітычных праблем, а толькі можа значна палепшыць матэрыяльнае становішча сялянства. Для дасягнення ў дзяржаве сацыяльнай раўнавагі неабходна было правядзенне аграрнай рэформы ў сукупнасці з карэннай перабудовай усёй эканамічнай структуры краіны. У цэлым трэба адзначыць, што Сейм быў важнаю пляцоўкаю дзейнасці СП, паслы якой складалі шматлікія інтэрпеляцыі (скаргі) на парушэнне дзяржаўнымі ўладамі правоў сялян падчас ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў [18, с. 212].

Асаблівае значэнне мела камасацыя, якая павінна была ліквідаваць цераспалосіцу і стварыць умовы для далейшага развіцця гаспадаркі. Ян Ледвах (Jan Ledwoch), адзін з лідараў партыі, сцвярджаў, што “камасацыя агортвае на падставе закона камасацыйнага (ад 31 ліпеня 1923 г.) землі сялянскія і можа агортваць землі памешчыцкія, колькасна залежна ад таго, колькі міністр (сельскай гаспадаркі) палічыць патрэбным вызначыць на надзяленне зямлёю сялян да пэўнай нормы і колькі памешчык згодзіцца перадаць на гэту справу”. Ледвах звяртаўся да сялян, каб яны зразумелі важнасць справы законнасці і накіроўвалі да павятовых камісараў просьбы аб надзяленні зямлёю падчас камасацыі, падкрэсліваў, што “пры камасацыі неабходна ініцыяваць і пільнаваць, каб унёскі камісара адпавядалі галоўным патрабаванням (сялян) і згодна з рэчаіснасцю паказвалі магчымасць перадачы зямель з навакольных маёнткаў”. Акрамя таго, Ледвах падкрэсліваў, што пры камасацыі зямельныя камісары не заўсёды скрупулёзна вызначалі абшары, якія маглі бы быць перададзены сялянам, а таксама сустракалі сур’ёзнае незадавальненне мясцовых памешчыкаў [14, с. 192–193].

Лідары СП адзначалі, што найлепшым шляхам уплыву дзяржаўных улад на сялянства стане правядзенне гарантаваных ім па аднаўленню незалежнасці аграрных рэформ. Галоўнаю мэтаю ажыццяўлення ў краіне аграрнай рэформы СП лічыла стварэнне шырокай сеткі дробных сялянскіх гаспадарак, якія б былі самастойнымі і насілі вытворчы характар [17, с. 262]. Кіраўніцтва СП адзначала, што на той час ІІ Рэч Паспалітая, як і іншыя краіны Цэнтральна-Усходняй Еўропы, заставалася выразна сялянскай і дэманстравала тэндэнцыю да захавання такой сутнасці на працягу многіх далейшых гадоў, у сувязі з чым сяляне павінны былі заняць у польскім грамадстве належнае ім першаснае месца [14, с. 177].

Як адзначаў Ян Домбскі, сялянскае жыццё не ведае такіх няроўнасцей, якія назіраюцца ў іншых сацыяльных класах. Незалежна ад свайго матэрыяльнага становішча, селянін звязаны з зямлёю непасрэдна і працуе на ёй. Сумесная і амаль аднолькавая праца ў такіх жа самых умовах збліжае людзей. Гаспадар звычайна не толькі працуе побач са сваімі работнікамі, але і есць з імі за адным сталом і такім чынам ураўнаваны з імі з поглядаў грамадска-таварысцкіх. Разам з тым палітык адзначаў, што поўная роўнасць паміж сялянамі не толькі немагчымая, але нават і шкодная. Здаровая дыферэнцыяцыя павінна адбывацца, але ў справядлівых межах. Дэмакратычная роўнасць павінна забяспечыць людзям права да роўнага жыццёвага старту без усялякіх штучных перашкод. Да гэтага ідэала найбольш за ўсё набліжана сялянскае жыццё, і, такім чынам, гарантуе яно дзяржаве дасягненне раўнавагі і грамадскага спакою [17, с. 266].

5 чэрвеня 1927 г. на Кангрэсе СП справа ажыццяўлення аграрнай рэформы і аддзяржаўлення лясных масіваў прызнана маючай галоўнае значэнне [7, с. 275; 10, с. 168]. Лідары партыі верылі ў магчымасць бяскроўнай перамогі ў краіне грамадскай справядлівасці, што было характэрна для многіх сялянскіх партый. Фармулюючы ідэалагічныя падставы партыі, Домбскі апіраўся на падыходы чэшскага аграрызму і, супрацьпастаўляючы марксісцкай тэорыі аб канцэнтрацыі капіталаў у сельскай гаспадарцы лічыў, што дробныя сялянскія гаспадаркі маюць у перспектыве вялікія магчымасці для развіцця, а нават праз парцэляцыю (падзел памешчыцкіх зямель) могуць зліквідаваць вялікую зямельную ўласнасць [5, с. 184]. Як яшчэ ў 1918 г. адзначаў Домбскі, “Зямля польская павінна належаць тым, хто на ёй уласнымі рукамі працуе. Вялікая памешчыцкая ўласнасць павінна быць падзелена паміж польскімі сялянамі, у першую чаргу малазямельнымі і беззямельнымі. Цяперашнім зямельным уладальнікам можна пакінуць не больш як па 300 маргоў. Сялянская зямельная ўласнасць павінна застацца непарушанай. На пазасталую зямельную ўласнаць належыць тэрмінова накласці высокі прагрэсіўны падатак” [12, с. 23, 28]. Разам з тым, палітык выступаў адначасова і супраць агітацыі камуністаў, падкрэсліваючы, што правядзенне справядлівай аграрнай рэформы адвярне сялян ад удзелу ў рэвалюцыйным руху і арганічна злучыць іх з дзяржаваю. Найбліжэйшымі саюзнікамі сялянства палітык лічыў прамысловых рабочых, аб’яднаных у ППС, але разам з тым адзначаў розніцу ў іх гаспадарчых падыходах: у той час як сяляне-вытворцы зацікаўлены ў павышэнні коштаў на сельскагаспадарчыя тавары, найперш за ўсё прадукты, рабочыя-спажыўцы зацікаўлены ў іх зніжэнні, у сувязі з чым Домбскі выступаў за пошук кампрамісу пры вызначэнні коштаў прадукцыі [17, с. 267].

СП адзначала, што перабудову дзяржаўнай гаспадаркі неабходна ажыццявіць парламенцкім шляхам, галоўную ролю ў гэтым павінна была адыграць дзяржава. Аграрная рэформа, на думку лідараў СП, павінна была складацца з шэрагу пераўтварэнняў: парцэляцыі (падзелу паміж сялянамі памешчыцкіх зямель), камасацыі (аб’яднання раскіданых сялянскіх надзелаў і хутарызацыі), меліярацыі зямель, ліквідацыі сервітутаў (права сумеснага зямельнага карыстання маёмасцю сялян і памешчыкаў), засаджванні лесам невыкарыстоўваемых зямель, выдачы сялянам на выгадных для іх умовах банкаўскіх крэдытаў, вызначэння прагрэсіўнага характару зямельнага падатку, рэгуляцыі коштаў з мэтаю забеспячэння самаакупнасці сельскагаспадарчай прадукцыі і г.д. [11, с. 311; 15, с. 265]. СП адзначала, што для поспеху аграрнай рэформы неабходна падтрымка дзяржаваю экспарту, шырокае выкарыстанне адборнага насення, сельскагаспадарчых машын, штучных угнаенняў, развіццё сельскагаспадарчай адукацыі і падтрымка агульнага ўнутранага рынку. У сувязі з гэтым СП патрабавала павышэння выдаткаў на сельскую гаспадарку за кошт скарачэння іх на адміністрацыю, паліцыю, войска і прамысловасць [14, с. 179]. Ян Домбскі падкрэсліваў, што сельская гаспадарка ІІ Рэчы Паспалітай мае вялікі патэнцыял для далейшага развіцця, найперш за ўсё праз ажыццяўленне парцэляцыі, таму ад становішча сельскай гаспадаркі і яе патрэб павінна і вызначацца эканамічная палітыка дзяржавы. Такім чынам, праграма СП ад чэрвеня 1927 г. падкрэслівала, што эканамічны лад ІІ Рэчы Паспалітай павінен абапірацца на дробную сельскую гаспадарку [15, с. 264], і таму, нягледзячы на тое, што партыя абвяшчала сябе заступніцаю ўсіх катэгорый польскага сялянства, праграма СП адпавядала найперш за ўсё інтарэсам сярэднезаможных сялян. У цэлым гаспадарчая праграма СП была набліжана да праграмы ПНП-“Вызваленне”, але ў большай ступені абмяжоўвала прыватнае землеўладанне [6, с. 69; 18, с. 217].

У 1927 г. Домбскі выступіў ад імя СП з падтрымкаю развіцця дробнай зямельнай уласнасці, абгрунтоўваючы гэта гістарычнымі абставінамі: “зямля, якою зараз валодаюць абшарнікі, раней была забрана ў сялян шляхтаю без ніякага выкупу”, а таксама сялянскім укладам у грамадскі дабрабыт: “сяляне ўжо даўно заплацілі за гэтыя шляхецкія землі сваёю працаю пад час паншчыны і з чыстым сумленнем могуць дабівацца (ажыццяўлення) аграрнай рэформы без выкупу (памешчыцкай зямлі)”. Разам з тым, нягледзячы на пераканаўчасць сваіх аргументаў, Ян Домбскі быў перакананы, што такі зямельны закон можа прыняць толькі сялянскі Сейм [12, с. 25].

У прынятай 7 ліпеня 1929 г. праграме СП вызначалася як “палітычная арганізацыя сялян класавага і радыкальнага характару”. Адмова ад ужывання тэрміна “народ” (lud) на карысць “сялянства” (chłop) адпавядала фактычнай эвалюцыі, якая наступіла ў сялянскім руху [17, с. 262]. Праграма СП патрабавала як мага хутчэйшага правядзення аграрнай рэформы і стварэння шырокага слою дробных

Репозиторий БрГТУ

сялянскіх гаспадарак, якія б служылі апораю эканамічнага ладу і грамадскай раўнавагі ў Польшчы [14, c. 186]. Максімум зямельнага ўладання вызначаўся ў 60 га, а надвыжкі павінны быць дзяржаваю канфіскаваны без усялякага выкупу. Канфіскаваную ў памешчыкаў зямлю ўрад павінен перадаць малазямельным і беззямельным сялянам па памяркоўнаму кошту з магчымасцю выплаты на працягу 40 гадоў. Сабраныя такім чынам сродкі сталі б асноваю меліярацыйнага фонда, вызначанага на падтрымку дробных сялянскіх гаспадарак. Неабходна адзначыць, што ў гэты час II Рэч Паспалітая была адною з самых аграрна перанаселеных краін Еўропы, але лідары СП адмаўлялі шлях масавай знешняй эміграцыі сялянства, што выклікае раскол і трагедыі ўнутры сямей і змушае сялян да жабравання ў чужой краіне.

Фабрычная прамысловасць адзначалася СП як важная галіна эканомікі, якая павінна апірацца найперш за ўсё на мясцовую сыравіну (у тым ліку і прадукты сельскагаспадарчай вытворчасці) і таннымі вырабамі забяспечваць патрэбы сялянства і ўсёй дзяржавы. СП прызнавала памешчыкаў, банкіраў і капіталістаў за палітычных ворагаў сялянства, а саюзнікамі сваімі лічыла фабрычных рабочых і працоўную інтэлігенцыю [17, c. 263].

З 1929 г. нарастаючы канфлікт паміж Сеймам і ўрадам падштурхнуў сялянскія арганізацыі да пошуку шляхоў аб'яднання, прычым СП была самаю актыўнаю і паслядоўнаю прыхільніцаю гэтага працэсу [7, c. 277]. Вынікам аб'яднаўчых тэндэнцый стала стварэнне восенню 1929 г. кааліцыі левых сіл – так званага "Цэнтралеву" (Centrolew) [6, c. 74; 18, c. 297–298]. 16 мая 1930 г. у сумеснай рэзалюцыі сеймавых клубаў сялянскіх партый на першы план былі пастаўлены палітычныя задачы: абарона інтарэсаў працоўных, дэмакратыі і рэспубліканска-парламенцкай формы кіравання; у гаспадарчай сферы ставілася задача пераадолення негатыўных наступстваў бясспланавай і хаатычнай эканамічнай палітыкі дзяржавы. Дзеля выпраўлення існуючай сітуацыі людоўцы патрабавалі найперш за ўсё ажыццяўлення падатковай рэформы, якая б зменшыла накладзены на вяскоўцаў цяжар, і ліквідацыі дыспрапорцыі паміж коштамі прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў [10, c. 170].

Лідары СП падкрэслівалі, што ажыццяўленне карэннай аграрнай рэформы стане адным з галоўных крокаў на шляху да "Польшчы Народнай" ("Polski Ludowej"). СП усяляк падтрымлівала і прапагандавала правядзенне аграрных пераўтварэнняў у II Рэчы Паспалітай з мэтаю павышэння заможнасці сялянства, без чаго было немагчымым далейшае эканамічнае развіццё краіны. Адзіным магчымым шляхам для дасягнення азначанай мэты з'яўляецца шырокае ажыццяўленне парцэляцыі дзяржаўных і памешчыцкіх зямель [14, c. 186]. Акрамя таго, СП патрабавала правядзення аграрных пераўтварэнняў на новадалучаных землях, што павінна было ўмацаваць польскае панаванне на гэтых землях і схіліць сімпатыі мясцовага сялянства на карысць дзяржавы.

15 сакавіка 1931 г. на аб'яднаўчым Кангрэсе ў Варшаве адбылося доўгачаканае злучэнне сялянскіх партый II Рэчы Паспалітай і стварэнне адзінай палітычнай арганізацыі – Народная Партыя (Stronnictwo Ludowe), што было сустрэта сялянамі з надзеяю і вялікім задавальненнем [11, c. 313; 13, c. 292].

**Заключэнне.** Такім чынам, па аграрнаму пытанню ў 1926–1931 гг. СП выступала за перадачу сялянам без выкупу памешчыцкіх зямель, іх усялякую падтрымку з боку дзяржавы і стварэнне такім чынам самастойных дробных сялянскіх гаспадарак, якія б сталі апораю польскай эканоміці. Ажыццяўленне карэннай аграрнай рэформы павінна было сбалансаваць польскае грамадства, запэўніць яго дабрабыт і стварыць "Польшчу народную". Дзеля дасягнення вызначаных у праграме мэт сялянскім партыям II Рэчы Паспалітай патрабавалася аб'яднанне, што і было ажыццёўлена ў 1931 г., але дабіцца рэалізацыі пастаўленых задач людоўцам так і не ўдалося. Разам з тым, у грамадска-палітычным жыцці краіны ў азначаны перыяд сялянскія партыі адыгрывалі вельмі істотную, але не вырашальную ролю.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / под ред. Ст. Скульского. – Мн.: Белорусская Академия наук, 1935. – 336 с.
2. Ajnenkiel, A. Od rządów ludowych do przewrotu majowego: zarys dziejów politycznych Polski 1918-1926 / A. Ajnenkiel. – Warszawa: Wydawnictwo Wiedza Powszechna, 1978. – 472 c.
3. Borkowski, J. Ludowcy w II Rzeczypospolitej. W 2 częściach. Cz. 1. / J. Borkowski. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1987. – 373 c.
4. Brzoza, Cz. Polska w czasach niepodległości i II Wojny Światowej (1918–1945) / Cz. Brzoza. – Kraków: Fogra, 2001. – 424 c.
5. Burger, W. Ruch ludowy wobec kwestii społeczno-ustrojowych II Rzeczypospolitej / W. Burger. – Szczecin: Wyższa Szkoła Morska w Szczecinie, 1983. – 414 c.
6. Gałaj, D. Chłopski ruch polityczny w Polsce / D. Gałaj. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 1969. – 144 c.
7. Hemmerling, Z. Ruch ludowy w Polsce, Bułgarii i Czechosłowacji, 1893-1930 / Z. Hemmerling. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1987. – 453 c.
8. Historia chłopów polskich: w 3 tomach. / Pod redakcją Inglotą Stefana. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1980. – T. 3. Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej – 715 c.
9. Holzer, J. Mozaika polityczna Drugiej Rzeczypospolitej / J. Holzer. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1974. – 670 c.
10. Kulwicki, E. Koncepcje społeczno-ekonomiczne ruchu ludowego w latach 1918–1931 / E. Kulwicki. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1971. – 278 c.
11. Leczyk, M. Oblicze społeczno-polityczne Drugiej Rzeczypospolitej / M. Leczyk. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1988. – 506 c.
12. Łuczak, A. Społeczeństwo i państwo w myśli politycznej ruchu ludowego II Rzeczypospolitej / A. Łuczak. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1982. – 272 c.
13. Madajczyk, Cz. Burżuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce (1918–1939) / Cz. Madajczyk. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1956. – 465 c.
14. Podgajna, E. Stronnictwo Chłopskie (1926–1931): studium z dziejów myśli politycznej / E. Podgajna. – Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2011. – 276 c.
15. Programy partii i stronnictw politycznych w Polsce w latach 1918–1939. – Rzeszów: Wyższa Szkoła Pedagogiczna w Rzeszowie, 1993. – 456 c.
16. Więzikowa, A. Stronnictwo Chłopskie, 1926–1931 / A. Więzikowa. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1963. – 291 c.
17. Wojtas, A. Problematyka agrarna w polskiej myśli politycznej 1918–1948 / A. Wojtac. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1983. – 484 c.
18. Zarys historii polskiego ruchu ludowego. W 2 tomach. T. 2, 1918–1939 / J. Borkowski [et al.]. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1970. – 602 c.


*Материал поступил в редакцию 10.08.13*

**HARMATNY V.P. Agrarian question in the program of peasant's party in 1926–1931**

Article tells about the attitude of Peasants Party in 1926-1931 for the deciding agrarian problem in II Rzeczpospolita. Actuality and sharpness of agrarian question were the reasons of making and wide activity large number of parties for protecting peasant's interests. Peasants Party was one of such parties and had among the peasant's wide popularity and authority. According to the making agrarian changes in II Rzeczpospolita party proclaimed necessity receiving peasants of landowner lands and making big number of little peasant's farms. Such aim can't be realized without of strong politician organization, that's the reason of unity peasant's parties in 1931.

Репозиторий БрГТУ